ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

12 жніўня 2010 года

# Аграрны тэхнічны ўніверсітэт: наперадзе яшчэ адна ўступная кампанія

**Недаборы ў шэрагу ВНУ не сталі сюрпрызам гэтай уступнай кампаніі: дэмаграфічная яма адыграла сваю адмоўную ролю. У сталічнай жа ВНУ аграрнага профілю, БДАТУ, — супрацьлеглая сітуацыя: конкурсы склаліся нават на платную форму навучання. Уступную кампанію ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце мы аналізуем разам з адказным сакратаром прыёмнай камісіі гэтай ВНУ Віктарам ЛОЎКІСАМ.**

— Агульны конкурс па ўніверсітэце аказаўся нават вышэйшым, чым у мінулым годзе — 2,73 заявы на месца. І гэта пры тым, што наборы на бюджэце немаленькія: усяго мы набіралі 543 чалавекі па ўсіх спецыяльнасцях — на тры тэхнічныя факультэты і адзін эканамічны. Дарэчы, на факультэце прадпрымальніцтва і кіравання склаўся конкурс 7,2 заявы на месца, праўда, тут была выдзелена невялікая колькасць месцаў — 30. Тым не менш нас вельмі радуе, што моладзь выбірае і спецыяльнасці, звязаныя з аграпрамысловым комплексам. Аграмеханіка, аграэнергетыка і тэхнічны сэрвіс у АПК — тры гэтыя напрамкі даволі запатрабаваны ў моладзі, і нават на платную форму конкурс дасягае 1,9 заявы на месца. Такім чынам, мы не можам прыняць усіх жадаючых нават на платнае навучанне.

***— Віктар Баляслававіч, з чым вы звязваеце павышэнне папулярнасці спецыяльнасцей, звязаных з сельскай гаспадаркай? Відавочна, тут сваю ролю адыгралі тыя меры дзяржаўнай падтрымкі, якія аказваюцца ў апошні час і сельскай моладзі, і абітурыентам, якія выбіраюць менавіта аграрную сферу.***

— Нельга сказаць, што назіраецца вялізны рост конкурсаў. Ён невялікі, але ёсць: у мінулым годзе сярэдні конкурс быў 2,6, а ў гэтым — 2,73. Але калі параўнаць з ВНУ, дзе ёсць цяжкасці з конкурсам ці ўвогуле недаборы, то мы можам гэты факт лічыць істотным. Прычын можна назваць некалькі. Па-першае — падтрымка, якая аказваецца дзяржавай аграпрамысловаму комплексу. Моладзь бачыць гэта і ведае, што будзе запатрабавана. Аграрны тэхнічны ўніверсітэт прадастаўляе ўсім выпускнікам бюджэтнай формы навучання працоўныя месцы, а часам вакансіі прапаноўваюцца нават платнікам. Многія нашы абітурыенты — з сельскай мясцовасці, і дакладна сабе ўяўляюць, дзе і кім яны будуць працаваць. Па-другое, у БДАТУ ў апошнія гады шмат зроблена для развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы навучання, абсталявання і добраўпарадкавання вучэбных карпусоў і інтэрнатаў. Абітурыенты і іх бацькі бачаць усё гэта, прыязджаючы на дні адкрытых дзвярэй, на цэнтралізаванае тэсціраванне. Такім чынам, імідж універсітэта ўплывае на агульную колькасць пададзеных заяў. Але мы занадта сябе не абнадзейваем, бо ў бліжэйшыя гады чакаецца рэзкае памяншэнне выпускнікоў сярэдняй школы: канечне, гэта паўплывае і на конкурс.

***— Які працэнт сяльчан у ліку вашых абітурыентаў? Ці многія ідуць па слядах сваіх бацькоў, якія працуюць на зямлі, а не захапляюцца рамантыкай "гарадскіх" прафесій?***

— У нас шмат абітурыентаў, якія сапраўды ведаюць, што такое праца ў аграрным сектары, улічваюць вопыт бацькоў і свядома выбіраюць гэты шлях. Сюды ж можна аднесці маладых людзей з малых гарадоў, якія паступаюць па мэтавым накіраванні. Квота месцаў для мэтавікоў павялічана да 30%, такім чынам, каля трэці нашых абітурыентаў — альбо сельскія жыхары, альбо выхадцы з гарадоў з насельніцтвам менш за 20 тысяч чалавек. Лічбу мэтавых месцаў вызначае Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, сёлета для ўладальнікаў мэтавых накіраванняў было выдзелена 131 месца. Але далёка не ўсе сяльчане бяруць мэтавыя накіраванні, таму агульная лічба сельскіх жыхароў сярод абітурыентаў ва ўніверсітэце дасягае паловы. Дарэчы, мы заўважалі, што пры павядзенні асобнага конкурсу для сельскіх і гарадскіх абітурыентаў бал сяльчан часта пераўвышаў гарадскі, таму праводзіўся агульны конкурс.

***— Вы вывучалі геаграфію мэтавых накіраванняў? Ці можна па ёй меркаваць аб тым, якія рэгіёны маюць найбольшую патрэбу ў кадрах сельскагаспадарчага профілю?***

— Мінсельгасхарч не проста даводзіць нам агульную лічбу мэтавых месцаў, але і размяжоўвае іх па спецыяльнасцях і абласцях. Таму ўскосна мы можам меркаваць, дзе і якіх спецыялістаў не хапае. У агульным магу сказаць, што больш за ўсё мэтавікоў у нас з Мінскай вобласці. З Магілёўскай вобласці, напрыклад, толькі сем чалавек, яшчэ менш з — іншых абласцей. Але гэта і заканамерна: хоць універсітэт рыхтуе кадры для ўсёй краіны, больш паловы нашых выпускнікоў працуюць усё ж у Мінскай вобласці. Трэба адзначыць, што ў нас запоўнены ўсе мэтавыя месцы. А па Міншчыне нават быў конкурс 1,5-2 чалавекі на адно месца, у залежнасці ад спецыяльнасці.

***— Атрымліваецца, маладых людзей не адшурхоўвае, па сутнасці, 5-гадовая адпрацоўка?***

— Відавочна, што так. Мэтавікі павінны адпрацаваць спачатку два гады па размеркаванні, а потым яшчэ тры гады згодна з накіраваннем. Адміністрацыя ўніверсітэта напярэдадні ўступнай кампаніі таксама была заклапочана: ці зробяць маладыя людзі такі выбар? Зрабілі. Як я ўжо казаў, праблем з запаўненнем мэтавых месцаў не ўзнікла, а нават быў "запас": 131 месца і 261 заява. Значыць, намеры моладзі вельмі сур'ёзныя — працаваць менавіта там, адкуль яны родам. Той, хто не жадае адпрацоўваць пяць гадоў, зусім не абавязаны заключаць мэтавы дагавор, можна проста скарыстацца правам удзельнічаць у сельскім конкурсе альбо ўвогуле паступаць на платнае.



***— Складваецца ўражанне, што абітурыенты аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта маюць даволі высокую матывацыю да атрымання аграрнай спецыяльнасці. Якую ролю тут можна адвесці прафарыентацыйнай рабоце?***

— Вельмі важную. За кожным факультэтам замацавана тая ці іншая вобласць, за кожнай кафедрай — той ці іншы раён, гэтыя падраздзяленні фарміруюць імідж універсітэта ў вачах моладзі з глыбінкі, расказваюць аб усіх перавагах працэсу навучання і адукацыі. Наша аўдыторыя — сельскія дзеці і дзеці з раённых цэнтраў. Мінчан у БДАТУ вучыцца ў сярэднім працэнтаў 7-8. Тым не менш замацаванне маладых спецыялістаў на сяле застаецца невысокім, гэта датычыцца не толькі аграрыяў, але і медыкаў, педагогаў. Паступова, спадзяюся, гэтая тэндэнцыя будзе пераможана.

***— Хацелася б закрануць і пытанне падрыхтаванасці паступаючых. У цэлым у краіне назіраецца зніжэнне тэставага бала. Вы гэта заўважылі па сваіх абітурыентах?***

— Прахадны бал на эканамічныя спецыяльнасці вышэйшы амаль на 100 у параўнанні з тэхнічнымі. Але зноў жа, паўтару, на сітуацыю яшчэ ўплывае малая колькасць месцаў: павышаецца канкурэнцыя паміж абітурыентамі. Што датычыцца энергетыкаў, механікаў і рамонтнікаў (тры нашы тэхнічныя факультэты), то прахадныя балы тут былі на ўзроўні 153-164, такім чынам, падрыхтаванасць абітурынтаў адрозніваецца не істотна.

Тэставы бал сапраўды панізіўся , і ў сувязі з гэтым — прахадны бал. У нашым універсітэце ён ніжэйшы на 10-15 пунктаў у параўнанні з мінулым годам. Выключэнне — аграмеханічны факультэт, на якім прахадны бал нават вырас на адзінку, але гэта звязана з тым, што тут вельмі вялікі набор — 240 чалавек. Безумоўна, агульная тэндэнцыя не радуе: любая ВНУ зацікаўлена ў тым, каб на першы курс прыходзілі добра падрыхтаваныя студэнты, інакш даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў на "даводку" студэнтаў да належнага ўзроўню.

***— Віктар Баляслававіч, ці ўзнікла ў гэтым годзе ў вашым універсітэце праблема з прыёмам дакументаў у апошні дзень? Ці паўплывала станоўча новае патрабаванне прыпыняць інфармаванне аб ходзе падачы дакументаў у 15 гадзін?***

— Так, гэта дапамагло папярэдзіць ажыятаж і "перакідванне" дакументаў у апошнія хвіліны. Я не працаваў у мінулым годзе ў прыёмнай камісіі, але ведаю ад калег, што за апошнія 2-3 гадзіны прыёму дакументы падавалі сотні людзей. Сёлета такога не было. Да 19 гадзін мы фактычна скончылі рэгістрацыю абітурыентаў.

***— Універсітэт зацікаўлены ва ўкараненні электроннай сістэмы рэгістрацыі дакументаў?***

— Канечне. Сёлета мы ўзялі электронную рэгістрацыю ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання — гэта вельмі зручна. Рэгістрацыя дакументаў у электронным рэжыме будзе эканоміць час абітурыентаў і дазіраваць нагрузку на прыёмную камісію. Мяркую, мы прыйдзем да гэтага ў бліжэйшыя гады.

***— Якія праблемы ўзнікалі ў прыёмнай камісіі пры рабоце з абітурыентамі? Здаецца, што пры паступленні на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці трэба ведаць столькі нюансаў...***

— Калі працуеш з людзьмі, то цяжкасцей не пазбегнуць. А калі абітурыентаў амаль паўтары тысячы, і ўсіх трэба зарэгістраваць за адносна невялікі адрэзак часу... Сёлета, на жаль, яшчэ і надвор'е было не на нашым баку. Супрацоўнікам давялося праявіць максімум прафесіяналізму і вытрымкі. На рэгістрацыі дакументаў, дарэчы, працавалі студэнцкія атрады БДАТУ, якія дапамагалі камісіі.

Згодзен, што правілы паступлення на нашу групу спецыяльнасцей багатыя на розныя тонкасці і выключэнні. Ёсць перавагі для выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення, асобны конкурс праводзіцца на мэтавыя месцы, потым — асобна сярод сельскіх жыхароў і гараджан. І калі супрацоўнікі прыёмнай камісіі падкаваны ў гэтых пытаннях, то абітурыенты — не, і часам яны цікавіліся сваімі правамі і магчымасцямі непасрэдна ў камісіі. Даводзілася накіроўваць іх за дакументамі, якіх не хапала. На будучыню хацеў бы параіць абітурыентам і іх бацькам вывучаць нюансы паступлення загадзя. Тэлефануйце на факультэты, прыязджайце на дні адкрытых дзвярэй і збірайце ўсе неабходныя дакументы.

***— Віктар Баляслававіч, галоўная асаблівасць аграрнай ВНУ ў тым, што, у адрозненне ад усіх астатніх вышэйшых навучальных устаноў, тут скончыўся яшчэ толькі першы этап уступнай кампаніі. Наперадзе — прыём завочнікаў.***

— Так, зараз мы чакаем восені. Вопыт апошніх гадоў паказвае, што заяў на завочнае аддзяленне вельмі многа. Параўнайце: калі на дзённую форму навучання сёлета было пададзена каля 1400 заяў, то на завочную форму мінулай восенню — звыш трох тысяч. Канечне, для ўніверсіэта гэта вялікая нагрузка — дзве ўступныя кампаніі запар. Восенню ўсё ўскладняецца дэфіцытам аўдыторый, паколькі прыём даводзіцца сумяшчаць з вучэбным працэсам. Тым не менш такі падыход — праводзіць уступную кампанію на завочную форму навучання ў лістападзе—снежні — я лічу апраўданым. Зараз жніво, гарачая пара, не варта адцягваць працаўнікоў сельскай гаспадаркі ад важнай справы. Прыём дакументаў будзе весціся з 1 па 30 лістапада, а ў снежні — уступныя іспыты. Мы можам таксама прымаць і сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання.

**Іна НІКІЦЕНКА.**

**Фота аўтара.**